**Т. А. ЛАЎРЫК,**
магістр філалагічных навук, аспірант
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

# ГІСТАРЫЧНАЯ ПРОЗА ЛЕАНІДА ДАЙНЕКІ: актуальныя аспекты вывучэння

УДК 821.161.3.09

У артыкуле прапануюцца новыя падыходы да вывучэння раманаў Л. Дайнекі «Меч князя Вячкі» (VII клас), «След ваўкалака» (X клас; павышаны ўзровень; дадатковае чытанне), якія ўваходзяць у школьную праграму па беларускай літаратуры. Разгледжаны сімвалы, якія займаюць знакавае месца ў раманах пісьменніка.

*Ключавыя словы:* Леанід Дайнека, гістарычны раманны цыкл, метады вывучэння, сімвалы, рыцарская культура, ваўкалакі, легенды, міфалогія.

The article proposes new approaches to the study of novels by L. Dajnieka «Mieč kniazia Viački» (The Sword of Prince Vyachka) (grade 7), «Śled vaŭkałaka» (Trace of the Werewolf) (grade 10; advanced level; extracurricular reading), which are included in the school curriculum in Belarusian literature. The article discusses the symbols that occupy a significant place in the writer's novels.

*Keywords:* Leanid Dajnieka, historical novel cycle, learning methods, symbols, chivalrous culture, werewolves, legends, mythology.

## Уводзіны

Леанід Дайнека (1940—2019) — пісьменнік, перакладчык, адзін са стваральнікаў гістарычнага рамана ў беларускай літаратуры, найбольшую вядомасць якому ў канцы XX ст. прынёс гістарычны цыкл раманаў: «Меч князя Вячкі» (1987), «След ваўкалака» (1988), «Жалезныя жалуды» (1993). Раманы Леаніда Дайнекі ўвайшлі ў вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Пісьменнік паглыбіўся ў сівую даўніну і адлюстраваў розныя перыяды станаўлення дзяржаўнасці на беларускіх землях, пачынаючы з XI ст. Ён стварыў яскравыя і запамінальныя вобразы рэальных гістарычных асоб — князёў Вячкі, Усяслава Чарадзея, Міндоўга.

Даследчыца В. Шынкарэнка слушна прапануе «з іменем Л. Дайнекі <...> звязваць з'яўленне ў айчыннай літаратуры гістарычнага раманнага цыкла» [22, с. 477]. Да гэтага нашы мастакі слова пісалі ў жанрах ваеннага ці сацыяльна-псіхалагічнага эпасу (цыклы раманаў І. Мележа, І. Навуменкі, І. Чыгрынава, В. Адамчыка).

У цыкле раманаў Леаніда Дайнекі непаслядоўны зварот да гісторыі краіны, аўтар звяртаўся то да аднаго гістарычнага перыяду, то да другога: «Меч князя Вячкі» — пачатак XIII ст., «След ваўкалака» — XI ст., «Жалезныя жалуды» — сярэдзіна XIII ст. Але назіраецца сувязь паміж героямі твора. Так, у рамане «Меч князя Вячкі» пісьменнік згадваў Усяслава Чарадзея, з роду якога быў князь Вячка, да Полацкага князя звяртаўся ён па дапамогу ў думках. У наступным рамане «След ваўкалака» аўтар раскрывае вобраз Усяслава, паглыбляючыся ў больш даўнія часы. У трэцім

рамане гістарычнага цыкла «Жалезныя жалуды» Леанід Дайнека апавядае пра вытокі Вялікага Княства Літоўскага і лёс яго першага князя — Міндоўга. У гэтым рамане таксама гучыць імя князя Усяслава Полацкага.

У беларускай гістарычнай прозе першай паловы XX ст. яшчэ адсутнічалі трывалыя традыцыі і канцэпцыя жанру гістарычнага рамана. Л. Дайнека рухаўся следам за У. Караткевічам, аўтарам раманаў і аповесцей пра мінуўшчыну Беларусі. Ён ішоў шляхам рамантычнага ўзнаўлення гістарычных падзей: «не хапала глыбіні погляду на эпоху знутры. <...> Асноўныя эпізоды і вобразы не адпавядалі меры мастацкай праўдзівасці, жыццёвай верагоднасці» [22, с. 484—485]. Пісьменнік ідэалізаваў вобразы гістарычных герояў, якія не былі такімі насамрэч.

У раманах Л. Дайнекі знайшлі ўвасабленне свет духоўнай культуры беларусаў, фальклорныя і міфалагічныя сімвалы. У зборніках паэзіі Дайнекі таксама сустракаем сімвалічныя вобразы: коласа, кветкі, кургана, крыніцы і інш. З іх дапамогай аўтар раскрывае пачуццё любові да бацькоўскага краю, родных мясцін. Заўважым: сам пісьменнік — з вёскі, нарадзіўся на Магілёўшчыне.

У пачатку свайго творчага шляху Леанід Дайнека звяртаўся да філасофскіх разваг, назіранняў за сутнасцю жыцця, за лёсам чалавека і яго прызначэннем. Раман «Меч князя Вячкі» стаў для яго першым крокам у мастацкім адлюстраванні значных падзей гісторыі Беларусі, звязаных са стварэннем Вялікага Княства Літоўскага, а гэта часы кіравання Усяслава Чарадзея і князя Міндоўга. У назвах раманаў гістарычнага цыкла выкарыстаны сімвалы. Назва першага рамана «Меч князя Вячкі» змяшчае сімвал магутнай зброі — мяча, які ўвасабляе свабоду і незалежнасць. Меч — сімвал улады і вышэйшай справядлівасці, выступае спалучальным звяном паміж Вячкам і героямі наступных раманаў — Усяславам, Міндоўгам. У рамане «След ваўкалака» ваўкалак — канцэптуальна значны, сімвалічны вобраз. Ваўкалакам называлі князя Усяслава Полацкага, які паказаны ў творы вялікім воінам, вешчуном, абаронцам людзей. У «Жалезных жалудах» сімвалічнае значэнне набываюць выкаваныя з жалеза жалуды, якія з'яўляюцца абярэгамі-талісманамі — заклікам для аб'яднання ў барацьбе супраць нашэсця Залатой Арды і Тэўтонскага ордэна, а таксама сімваламі стварэння моцнай дзяржавы.

## Асноўная частка

**Раман Л. Дайнекі «Меч князя Вячкі» (1987).** Твор апавядае пра барацьбу Полацкага княства з крыжацкімі нашэсцямі ў пачатку XIII ст. Легендарны гістарычны персанаж у рамане — князь Вячка, сапраўдны патрыёт, беларускі ваяр, мужны змагар за сваю зямлю, годны чалавек і добры бацька.

У метадычнай літаратуры, дзе акрэслены падыходы да вывучэння рамана Л. Дайнекі на ўроках літаратуры, рэкамендуецца правесці змястоўны аналіз вобраза галоўнага героя: зрабіць акцэнт на характары князя, патлумачыць яго паводзіны, прычыны, паводле якіх ён вымушаны быў ісці насуперак сумленню. Пэўнае месца адводзіцца разгляду вобразаў епіскапа Альберта, графа Пірмонта, Генрыха — стваральніка «Хронікі Лівоніі». Таксама прапануецца падзяліць персанажаў на абаронцаў Кукейноса і іх ворагаў. Такім чынам, пры аналізе мастацкага твора настаўнік засяроджвае ўвагу на трактоўцы вобразаў герояў твора, вызначэнні іх менталітэту і рыс характару [12, с. 306].

Падобнага падыходу прытрымліваецца Я. Есіс, які ў плане-канспекце ўрока (VII клас) фармулюе пытанне наступным чынам: «Як вы разумееце назву рамана "Меч князя Вячкі"? Ці адпавядае яна падзеям, што расказваюцца ў творы? Якую назву твору далі б вы?» [9, с. 101]. Твор прапануецца вывучаць з пункту гледжання інфарматыўнасці зместу. Хацелася б, каб метадычная распрацоўка ўрока скіроўвала на паглыблены разгляд праблематыкі твора, якую падымае і асэнсоўвае пісьменнік.

Раман Л. Дайнекі напісаны ў рамантычным стылі, да таго ж гістарычны твор не абавязкова павінен паказваць рэальныя тагачасныя падзеі. «Чытач, які разлічвае пазнаёміцца ў гістарычным рамане з тым ці іншым гістарычным матэрыялам, здзяйсняе тую ж памылку, што і пісьменнік, які імкнецца канкураваць з гісторыкам. Аўтар гістарычнага рамана імкнецца адлюстраваць самога сябе і сваё ўяўленне пра свет. Патрабаваць ад аўтара гістарычных звестак — гэта ўсё роўна што спытаць у кампазітара, як зроблена радыё» [20, с. 109], — слушна пісаў Л. Фейхтвангер.

Далучыць вучняў да нацыянальнай літаратуры, культуры і гісторыі роднага краю раім праз зварот да папулярных твораў у

жанрах фэнтэзі, гістарычнай і прыгодніцка-гістарычнай прозы. Сёння сярод падлеткаў і моладзі назіраем цікавасць да рыцарскай культуры і традыцый мінулага: існуюць шматлікія клубы гістарычнай рэканструкцыі; праходзяць фестывалі сярэднявечнай культуры — «Наваградскі замак» у Навагрудку, «Рубон» у Полацку, штогадовы фэст у Мсціславе і інш. Раман «Меч князя Вячкі» можна аднесці да твораў, якія ў аснове сваёй маюць традыцыі і жанравыя рысы рыцарскага рамана, які на сучасным этапе трансфармаваўся ў жанр фэнтэзі. Такім чынам, каб паўплываць на больш пільную ўвагу вучняў да рамана, на матывацыю да яго прачытання, патрабуецца пэўная карэкціроўка ў падыходах да яго вывучэння на ўроках беларускай літаратуры. Напрыклад, мэтазгодна засяродзіць увагу на рыцарскім рамане і атрыбутах рыцарскай культуры.

Меч як рыцарскі атрыбут — найбольш складаны і да таго ж сакральны сімвал. З аднаго боку, меч — гэта зброя, з другога — своеасаблівы талісман, абярэг, які з'яўляецца яе супрацьлегласцю. У далёкія ад нас часы ён быў аб'ектам пакланення, абагаўлення; лічылася, што ён валодае таямнічай сілай. Паводле міфаў, меч — улюбёная зброя багоў і паўбагоў, гэта дар, пасланы на зямлю з нябёсаў [2, с. 6]. Меч сам па сабе мог мець непаўторны выгляд, так бы мовіць, сваю «індывідуальнасць», вельмі часта яму надавалі імя: у караля Артура быў Эскалібур, у Зігфрыда — Бальмонт. Меч — сімвал улады, вышэйшай справядлівасці, усюдыпранікальнага розуму, праніклівасці, сілы, святла, падзелу і смерці [15, с. 136].

Лірычны герой у «Грунвальдскай баладзе» Л. Дайнекі паўстае як мужны ваяр са зброяй у руках: «...з мячом, з дзідай, з бацькоўскай славай, // Я на полі Грунвальдскім стаяў» [6, с. 70].

«Толькі самаму лепшаму ваяводзе ўручае полацкае веча Усяславаў меч, прычым кожны раз выкоўваецца новы меч і асвячаецца ў Сафійскім саборы» [7, с. 138]. І такога мяча заслугоўваў смелы ваяр князь Вячка.

Пры вывучэнні рамана «Меч князя Вячкі» назва твора падзяляецца на два складнікі — *меч* і *князь Вячка*. Вобраз князя вызначаецца як цэнтральны, ідэяўтваральны, а меч увасабляе ці сімвалізуе свабоду выбару. Вячка выбірае паміж мячом і дачкой, аддае перавагу мячу і свабодзе. У складанай сітуацыі ён прымае рашэнне спаліць Кукейнос, каб не аддаць яго ворагам. Сімвалічна, што ў канцы рамана, пасля смерці князя, Усяславаў меч быў выратаваны. У гэтым бачыцца сувязь пакаленняў і вера ў светлую будучыню, якую здабудуць нашчадкі Вячкі.

Пры ўмове таго, што вучні прачыталі раман цалкам, у час разгляду твора звяртаецца ўвага на наступныя эпізоды:

- уручэнне мяча слаўнаму ваяру-пераможцу;
- яго знешні выгляд;
- элементы мяча;
- працэсы стварэння і ўручэння.

На многіх мячах было кляймо вытворцы, вялікае значэнне надавалася таму, які майстра будзе яго каваць. Таму для стварэння Усяслававага мяча быў выкліканы вядомы майстра — немец-тэўтон Фердынанд, які займаўся кавальскай справай і ствараў такую зброю, ведаў, які метал патрэбны. Звернем увагу і на тое, што меч і рыцар былі непарыўна звязаны: у час вайны меч выкарыстоўваўся як зброя, а ў час міру дэманстраваў статус уладальніка.

У апісанні зброі ў рамане адлюстраваны фантастычны элемент: вера ў звышнатуральнасць Усяслававага мяча. Меч валодаў незвычайнай сілай: у яго рукаяць укладаліся святыя мошчы, якія павінны былі спрыяць перамогам яго ўладальніка. Таму мошчы падмяняюць на барсукову костку, якая пацягне князя да зямлі, пазбавіць меч моцы. Зброя мела выключна важнае значэнне для дасягнення поспеху, перавагі ў паядынку, таму дбалі пра яе якасць, надзейнасць. Вось што гаворыцца пра выраб і выгляд сярэднявечнага мяча: «Меч рабілі доўгі, двухручны, каб дзвюма рукамі мог вой браць яго ў час бою за рукаяць. Лёзы ў клінка з абодвух бакоў былі вострыя, натачаныя. Крыжавіну і рукаяць абклалі чэрненым срэбрам, і срэбра тое гузавата, няроўна лягло. Не будзе слізгаць рука. На наверша рукаяці паклалі каштоўны камень, але потым яго замянілі на мошчы Святой Ефрасінні Полацкай. Бо не каштоўнымі камянямі змагаюцца, а святымі мошчамі. Трохі ніжэй рукаяці на адным баку клінка выбілі выяву святога Юрыя, з другога боку "Усяслаў" полацкімі літарамі на жалезе напісалі» [7, с. 148—149]. Рыцарскі меч — не толькі баявы рыштунак-даспех, а сакральная рэч.

У рамане Л. Дайнекі меч накіроўваўся ў Полацк з вялікай працэсіяй, таму што ў тыя часы такая зброя вельмі дорага каштавала. Яго павінны ўручыць князю Вячку, які ўзначаліць войска ў змаганні з Ордэнам. Пісьменнік абмалёўвае гэты рытуал:

«Епіскап Дыянісій узяў меч у абедзве рукі, на выцягнутых руках панёс да памосту, дзе стаяў князь Вячка. <...> Цішыня абрынулася на плошчу, толькі чутны былі крокі епіскапа.

Епіскап, кусаючы ад хвалявання вусны, падышоў да памосту. Князь Вячка зняў з галавы шлем, аддаў яго свайму дружынніку, апусціўся на калені. Твар быў бледна-ружовы.

— Князь Вячаслаў, — на ўсю моц голасу сказаў епіскап, — святая Сафія, стольны Полацк, усе мужы-палачане ўручаюць табе меч Усяславаў. Вазьмі меч, князь.

Вячка, не ўздымаючыся з каленяў, узяў меч, тройчы пацалаваў светлае лязо» [7, с. 159].

Для падрыхтоўкі да ўрока вучням прапануецца стварыць невялікі слоўнік назваў элементаў мяча.

*Меч* — доўгая клінковая зброя з прамым клінком і адкрытай рукаяццю.

Меч складаўся з наверша, крыжавіны, долу, чэрану рукаяці, рукаяці, ляза.

*Наверша* — галоўка (яблыка), якое выконвае ролю супрацьвагі мяча.

*Крыжавіна* абараняла руку ад траўм і выконвала ролю супрацьвагі, аддзяляла лязо ад рукаяці. Наверша і крыжавіны даволі часта аздабляліся арнаментам.

*Дол* — жалабок, паглыбленне ў клінку для аблягчэння, бо з доламі клінок меў меншую вагу.

Для захавання каштоўнага клінка ад вільгаці выкарыстоўваліся *похвы*.

Похвы абаранялі каштоўны клінок ад вільгаці. Аздобленыя металічнымі накладкамі і наканечнікам, яны былі сімвалам маёмаснага статусу ўладальніка.

Завяршае пісьменнік раман «Словам на развітанне», дзе сімвалічна гучаць словы гонару за продкаў, якія змагаліся з мячом у руках: «З хвалюваннем і гордасцю думаю я, што не зганьбілі меч Усяславаў сыны нашай зямлі. Бязлітасна біў ён ворагаў на рацэ Нёман і на Чудскім возеры, на полі Куліковым і пад Грунвальдам. Яго ўзнімалі і Давід Гарадзенскі, і Андрэй Полацкі, і іншыя беларускія героі» [7, с. 301]. Гэтыя словы падкрэсліваюць значнасць вобраза-сімвала мяча ў творы, які ўвасабляе сувязь пакаленняў, імкненне да незалежнасці і змаганне за яе нашых продкаў у розныя часы.

Вучням дадаткова прапануецца пазнаёміцца з літаратурай, прысвечанай традыцыям рыцарскай культуры на Беларусі, наведаць замкі, дзе яна фарміравалася, у першую чаргу — Мірскі замак і замак Міндоўга ў Навагрудку. Прапанаваная літаратура дапаможа зацікавіць вучняў творамі ў жанры гістарычнай прозы *(Дадатак 1)*.

**Раман Л. Дайнекі «След ваўкалака» (1988).** Другі гістарычны раман пісьменніка таксама мае сімвалічную канцоўку, якая звязана з мячом. Аўтар падкрэслівае значнасць гэтай зброі:

«— Пакланіцеся ж гэтаму мячу, які павядзе нас дадому!

І адбылося пакланенне мячу. Тысячы людзей апусціліся на калені» [8, с. 284—285].

Раман прапануецца для вывучэння ў школе як твор для дадатковага чытання ў X класе (павышаны ўзровень). Традыцыйна вучні разглядаюць гістарычныя падзеі, адлюстраваныя ў творы, вобраз галоўнага героя — славутага князя Усяслава Полацкага. Князя называлі Чарадзеем і ваўкалакам, пра яго можна шмат даведацца з гістарычных крыніц. Звесткі пра асобу Усяслава вучні атрымоўваюць на ўроках гісторыі. Яны ведаюць, што знакамітая бітва на Нямізе адбылася 3 сакавіка 1067 года, гэта першая летапісная згадка пра Мінск. Менавіта тады на беразе ракі Нямігі войскі князя Усяслава Полацкага выступілі супраць аб'яднаных сіл кіеўскага, чарнігаўскага і пераслаўскіх князёў (князёў Яраславічаў). У выніку палачане адступілі, загінула шмат воінаў. Аўтар «Слова пра паход Ігаравы» згадваў пра гэту бітву:

На Нямізе галовы сцелюць снапамі,
Харалужнымі малоцяць цапамі,
Жыццё кладуць на таку злюцела,
Веюць душу ад цела.
Нямігі крывавыя берагі
Не збожжам былі засеяны зноў —
Засеяны косцьмі рускіх сыноў [18, с. 59].

Пасля бітвы князь з двума сынамі накіраваўся падпісаць мірнае пагадненне з Яраславічамі, але быў паланёны і пасаджаны ў поруб.

У рамане пісьменнік адлюстраваў самы трагічны перыяд жыцця князя Усяслава Полацкага, калі ён ужо не спадзяваўся на выратаванне. Аднак кіяўляне вызвалілі князя з няволі, каб ён абараніў іх ад войскаў хана Шурукана. У гістарычных дакументах аб перыядзе полацкай гісторыі, калі Усяслаў з сынамі знаходзіўся ў кіеўскім порубе, нічога невядома [5, с. 161]. Пра паўстанне, якое паднялі кіяўляне, каб вызваліць князя Усяслава, згадваецца ў старажытным летапісе: «"Пойдзем вызвалім дружыну сваю з турмы".<...> Людзі ж вызвалілі Усяслава з турмы ў 15-ы дзень

верасня і ўшанавалі яго пасярод княскага двара» [1, с. 27—28]. Пра ўладаранне князя ў Кіеве, якое доўжылася 7 месяцаў, нічога ў летапісах не паведамляецца.

У рамане «След ваўкалака» Л. Дайнека паказвае гэтыя месяцы ў жыцці князя. Аўтар дэталёва абмалёўвае вобраз галоўнага героя, пры гэтым дае волю ўласнай фантазіі і такім чынам па-мастацку ўзнаўляе прабел у яго жыццяпісе, перадае яго становішча ў зняволенні. А. С. Кавалюк, аналізуючы вобраз князя Усяслава ў творы Л. Дайнекі, адзначае: «На змрочным фоне кіеўскага поруба, а пазней на не менш змрочным фоне пакінутага вялікакняжацкага прастола яшчэ ярчэй выяўляюцца тыя бліскучыя якасці Усяслава, якія сапраўды прыцягнулі да гэтага чалавека ўсю славу, зрабілі яго імя бессмяротным праз стагоддзі» [11, с. 299].

Л. Дайнека спрабуе высветліць, чаму полацкага князя называлі чараўніком. Манахам Пячэрскага манастыра было даручана дапытаць князя і зразумець, хто ён такі насамрэч. У «Аповесці пра Усяслава Полацкага» згадвалася, што маці нарадзіла яго з дапамогай чарадзейства. Леанід Дайнека апісвае абярэг, які насіў заўсёды на поясе князь, — «яйна», ці кашулю, у якой ён нарадзіўся, яна давала яму моц і сілу, таму ён ніколі яе не здымаў. У выніку манахі адзначалі: «Усяслаў не з тых, хто лёгка прыручаецца. Не рахманая авечка полацкі князь, а сапраўдны лясны тур. <...> Незразумелы страшны чалавек» [8, с. 28].

На ўроку, акрамя разгляду вобраза галоўнага героя і падзей, якія разгортваюцца пасля яго вызвалення з поруба, варта звярнуць увагу на назву рамана і яе сімвалічнасць. Мэтазгодна напачатку падкрэсліць якасці асобы князя Усяслава. Згадаем, як аўтар «Слова пра паход Ігаравы» гаворыць пра яго:

Усяслаў-князь людзям чыніў суды,
Радзіў князям гарады,
А сам уночы ваўком рыскаў.
З Кіева паспяваў да пеўняў да Тмутараканя,
Хорсу вялікаму шлях перацінаў [18, с. 59].

Застаецца загадкай прычына, праз якую князь Усяслаў накіраваўся ў Тмутаракань. Выказваюцца меркаванні, што там ён набіраў войска для барацьбы і змагання з полаўцамі [19]. Леанід Дайнека прапануе ўласнае тлумачэнне разгрому Усяславам войска захопнікаў: на дапамогу кіяўлянам прыйшлі язычнікі, якія пасля хрышчэння Русі жылі ў лясах. Князь паабяцаў ім: «хрысціяне і паганцы будуць жыць у Кіеве, як браты, як сыны адной зямлі» [8, с. 247]. В. К. Шынкарэнка адзначае, што праблема супрацьстаяння хрысціянства і веры нашых продкаў на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага адлюстравана ў некалькіх раманах Леаніда Дайнекі. Твор «След ваўкалака» ўтрымлівае апісанні паганскага капішча, могільніка продкаў, свяшчэннай дубровы, выявы Перуна, вобразаў вешчуноў, прымхаў, язычніцкіх і хрысціянскіх абрадаў, царкоўных служэнняў [23]. Усяслаў разважае пра сваё стаўленне да рэлігіі. Пабудаваўшы Святую Сафію ў Полацку, ён у душы не стаў хрысціянінам і думае пра тое, што сам адрокся ад старых багоў, хоць і прынёс новую веру ў княства.

Леанід Дайнека ў гістарычных раманах досыць часта ўздымае пытанне асабістага выбару: «Ды ці ёсць у мяне тыя святыні. Я хрысціянін, бо ўсе навокал зрабіліся хрысціянамі. Заўтра прыйдуць іўдзеі, і я зраблюся, як і ўсе, іўдзеем. І буду праслаўляць іўдзейства, буду маліцца Іегове» [8, с. 239]. Вынікам разважанняў становіцца адмова Белавалода, аднаго з герояў твора, ад хрысціянства, ён здымае з сябе святы крыж. Гэта свядомы выбар: адмовіўся ён не ад Бога, а ад людзей, якія неслі і зацвярджалі новую веру агнём і мячом. Ён — за спакой, святло і прыроду, таму і гатовы загінуць за сваю веру. Аўтар паказвае тагачасныя рэлігійныя супярэчнасці, але і ўздымае ідэю яднання, адзінства народа, якому трэба абараніць сваю зямлю.

На ўроку па вывучэнні рамана «След ваўкалака» будзе цікава прааналізаваць, чаму князя называлі ваўкалакам. Гэта слова ўтрымлівае назва твора. Ужо ў пачатку рамана пісьменнік засяроджвае ўвагу чытача на гэтым вобразе. Калі князь Усяслаў разам з сынамі апынуўся ў порубе, у Полацку пачалі адбывацца дзіўныя рэчы: кожную ноч у розных канцах горада чуўся пранізлівы журботна-дзікі крык. Палачане з упэўненасцю казалі: «Князь Усяслаў крычыць. <...> Прыбягае з кіеўскага поруба ў сваю вотчыну і крычыць» [8, с. 48]. Такім чынам пісьменнік падкрэслівае незвычайныя здольнасці князя і ўпэўненасць простага люду ў тым, што ён пярэварацень.

Вобраз ваўкалака па-рознаму падаецца ў міфалогіі і мастацкай літаратуры.

У балцка-славянскай міфалогіі быў вельмі распаўсюджаны матыў пераўтварэння, перадусім — у ваўка. У заходніх краінах пра пярэваратняў вядома здаўна, гісторыі пра іх сустракаюцца ў легендах Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма. На працягу шматлікіх стагоддзяў захавалася вера ў тое, што пярэварацень бегае па начах, нападае на людзей ці жывёл. Вера ў пярэваратняў працягвае існаваць і па сёння ў Кітаі, Індыі, Інданезіі, Асаме і некаторых афрыканскіх краінах. Згодна ўяўленням у гэтых краінах, чалавек можа ператварацца ў дзікіх лютых жывёл — гіен, тыграў, кракадзілаў і ваўкоў. Заснаваная на міфалогіі, рэлігійная інтэрпрэтацыя ператварэння чалавека ў жывёлу ўспрымаецца як божая кара ці сувязь з д'яблам [14, с. 115].

Даследчык XIX стагоддзя П. М. Шпілеўскі прысвяціў тэме ваўкалакаў «Даследаванне пра ваўкалакаў на аснове беларускіх павер'яў» (1853), дзе разважае пра паходжанне гэтага вобраза ў беларускім фальклоры [21, с. 9]. Таксама пра ваўкалакаў можна даведацца з этнаграфічнага нарыса А. Я. Багдановіча «Перажыткі старажытнага светаўспрымання ў беларусаў» (1895, на рус. мове). Ваўкалакам называлі чалавека, які ператвараўся ў ваўка з дапамогай спецыяльнага абраду, але ім мог стаць і звычайны чалавек пад уздзеяннем чар ці праз нейкія правіны [3]. Падобная легенда «Ваўкалакі» размешчана ў зборніку «Бяздоннае багацце: легенды, паданні, сказы» (1990). Сучасны фалькларыст А. М. Ненадавец адзначае, што «ў міфалагічных уяўленнях многіх народаў свету вобраз ваўка асацыіраваўся з вобразам правадыра баявой дружыны або нават самога бога вайны і пачынальніка плямёнаў» [13, с. 245].

У рускай міфалогіі ваўкалакі падзяляліся на тых, хто ператварыўся ў ваўка па ўласнай згодзе, хто быў ператвораны чараўніцтвам і прыроджаных. Сустракаюцца адмоўныя і станоўчыя вобразы ваўкалака. Станоўчы — больш старажытны, звязаны з татэмізмам і таемнымі вайсковымі саюзамі. У некаторых плямёнах (напрыклад, у вільцоў) воўк быў татэмам, паводле вераванняў, на некалькі дзён у год кожны з племені ператвараўся ў ваўка [17, с. 258].

Ян Баршчэўскі ў апавяданні «Ваўкалак» з кнігі «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» таксама звяртаецца да гэтага вобраза. Ён не адыходзіць ад традыцыйных поглядаў на ваўкалака, у якога ператвараецца чалавек пад уплывам чар. Бедны юнак трапляе ў пастку, і толькі праз доўгі час яму ўдалося зноў стаць чалавекам.

У мастацкай літаратуры многія пісьменнікі па-іншаму ўвасабляюць вобраз ваўкалака. У «Ваўкалаку» Альгерда Абуховіча гэта істота — сімвал свабоды, незалежнасці, вылучаецца сваімі здольнасцямі і магчымасцямі. Вобраз неадназначны: ваўкалак, хоць і прагне справядлівасці, але з'яўляецца праявай нячыстай сілы. Чарамі надзяляе Вольга Іпатава крошынскага каваля Паўлюка Багрыма з апавядання «Ваўкалакам абярнуся», які шукае шлях для сябе і свайго народа: «...І папаўзла па Крошыну чутка, што ўсялілася ў каваля Багрыма нетутэйшая сіла, ператварыўся ён у ваўкалака. Таму і не спіць начамі, і блукае да самых пеўняў у лясах і балотах» [10, с. 194].

Выключныя здольнасці асобы Усяслава Чарадзея спарадзілі легенды, яго называлі ваўкалакам, далучалі да чарадзееў, вешчуноў (чарадзеі, прадказальнікі, якія маглі кіраваць прыроднымі стыхіямі). Яго вобраз у «Слове пра паход Ігаравы» мае станоўчыя рысы: «Малюючы князя ваўкалакам, аўтар не бачыць у гэтым нічога асуджальнага, нават апісвае той учынак з пахвалою і добразычлівасцю» [4, с. 89].

Леанід Дайнека не адыходзіць ад версіі «Слова пра паход Ігаравы», дзе Усяслава Полацкага ваўкалакам называе Баян. З дапамогай прыёму пераўвасаблення падкрэсліваюцца надзвычайныя якасці героя, тое, што адрознівае яго ад іншых і што цяжка растлумачыць.

Паэт Алесь Разанаў у паэме «Усяслаў Чарадзей» так характарызуе князя Полацкага:

Не назіраў —
А бачыў,
Не слухаў —
А чуў,
Крылаў не меў —
А лётаў [16, с. 207].

Вучням загадзя прапануецца дадатковая літаратура з мэтай азнаямлення з легендамі беларускага фальклору і мастацкай літаратурай пра ваўкалакаў, з апісаннем вобраза князя Усяслава Чарадзея *(Дадатак 2)*.

# Заключэнне

Л. Дайнека — аўтар гістарычнага раманнага цыкла: «Меч князя Вячкі», «След ваўкалака», «Жалезныя жалуды». Пісьменнік паказаў розныя перыяды станаўлення старажытнай беларускай дзяржавы, стварыў яскравыя мастацкія вобразы рэальных гістарычных асоб — князёў Вячкі, Усяслава Чарадзея, Міндоўга.

Пры вывучэнні ў школе твораў «Меч князя Вячкі» і «След ваўкалака» неабходна запыніцца не толькі на характарыстыцы галоўных герояў, падкрэсліць такія іх якасці, як валявы характар, актыўнасць, такія рысы светапогляду, як патрыятызм, вернасць роднай зямлі. Трэба адзначыць сімвалічнасць загалоўкаў: з дапамогай назваў аўтар імкнуўся наблізіць сівую мінуўшчыну да сённяшніх часоў, заінтрыгаваць і зацікавіць чытача. На ўроках беларускай літаратуры важна акцэнтаваць увагу вучняў на гэтай сувязі часоў, пакаленняў, гераічных традыцыях продкаў. Вельмі важна ўмець знаходзіць паміж радкоў і разумець галоўную ідэю твора, якую пісьменнік увасабляе, імкнучыся данесці да чытача вельмі важныя думкі і сэнсы.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Аповесць пра Усяслава Полацкага // Беларускія летапісы і хронікі / уклад. У. Арлоў ; навук. рэд. і аўтар прадм. В. Чамярыцкі. — Мінск : Беларус. кнігазбор, 1997. — С. 26—28.
2. *Бёртон, Р. Ф.* Книга мечей: холодное оружие сквозь тысячелетия / Р. Ф. Бёртон. — М. : Центрполиграф, 2005. — 396 с.
3. *Богданович, А. Е.* Пережитки древнего миросозерцания у белорусов : этногр. очерк / А. Е. Богданович. — Гродна : Губернская тип., 1895. — 186 с.
4. *Войтович, В. М.* Українська міфологія : енцикл. народних вірувань / В. М. Войтович. — 4-е вид., доп. — К. : ФОП Стебеляк, 2014. — 687 с.
5. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Соврем. шк. ; Экаперспектыва, 2000. — Т. 1 : Старажытная Беларусь: Ад першапачатк. засялення да сярэдзіны XIII ст. — 350 с.
6. *Дайнека, Л.* Мая вясна саракавая : вершы / Л. Дайнека. — Мінск : Маст. літ., 1979. — 126 с.
7. *Дайнека, Л.* Меч князя Вячкі : раман / Л. Дайнека. — Мінск : Юнацтва, 1987. — 300 с. — (Б-ка прыгод і фантастыкі).
8. *Дайнека, Л.* След ваўкалака : раман / Л. Дайнека. — Мінск : Маст. літ., 1988. — 285 с.
9. *Есіс, Я. В.* Беларуская літаратура: планы-канспекты ўрокаў: 7-ы клас: (2-е паўгоддзе) : дапам. для педагогаў устаноў агул. сярэд. адукацыі / Я. В. Есіс. — 2-е выд. — Мазыр : Выснова, 2021. — 116 с.
10. *Іпатава, В.* Ваўкалакам абярнуся / В. Іпатава // Прадыслава : аповесці і апавяданні / В. Іпатава. — Мінск : Беларусь, 1997. — С. 190—194.
11. *Кавалюк, А. С.* Вобраз полацкага Усяслава ў «Слове пра паход Ігаравы» і рамане Л. Дайнекі «След ваўкалака» / А. С. Кавалюк // Шостыя рэспубліканскія Калеснікаўскія чытанні : матэрыялы Рэсп. навук. канф., прысв. 85-годдзю з дня нар. У. А. Калесніка, Брэст, 26 кастр. 2007 года. «Слова аб палку Ігаравым» у літаратуры і духоўнай культуры славянскіх народаў: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Брэст, 27—28 крас. 2007 г. — Брэст : Альтэрнатыва, 2008. — С. 297—300.
12. *Логінава, Т. У.* Беларуская літаратура ў 7 класе : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Т. У. Логінава, Т. І. Мароз. — Мінск : Сэр-Віт, 2005. — С. 301—318.
13. *Ненадавец, А. М.* Міфалогія роднага краю / А. М. Ненадавец. — Мінск : Беларусь, 2018. — 399 с.
14. *Нолл, Р.* Вампиры, оборотни, демоны в психиатрической литературе XX века / Р. Нолл ; пер. с англ. В. Менжулина. — Киев : Факт, 1999. — 250 с.
15. Полная энциклопедия символов. — М., СПб : Сова, 2006. — С. 135—136.
16. *Разанаў, А.* І вынайшаў я крылы — вось яны / А. Разанаў. — Вільня [Вільнюс] : Логвінаў, 2014. — 251 с.
17. Русский народ: его обычаи, предания, обряды / собр. М. Забылиным ; [лит. обработка текста В. Татаринов]. — Москва : Эксмо, 2003. — 606 с.

18. Слова пра паход Ігаравы / [пер. Р. Барадуліна]. Песня пра Зубра : паэмы / Мікола Гусоўскі ; [пер. Я. Семяжона ; да зб. у цэлым: уклад. В. В. Кушнярэвіч]. — Мінск : Маст. літ., 1999. — 186 с. — (Шк. б-ка).

19. *Тарасаў, С. В.* Чарадзей сёмага веку Траяна: Усяслаў Полацкі / С. В. Тарасаў. — Мінск : Навука і тэхніка, 1991. — 71 с.

20. *Фейхтвангер, Л.* О смысле и бессмыслице исторического романа / Л. Фейхтвангер // Лит. критик. — 1935. — № 9. — С. 106—111.

21. *Шпилевский, П.* Исследование о вовколаках на основании белорусских поверий / П. Шпилевский. — [Б. м., 1853]. — 30 с.

22. *Шынкарэнка, В. К.* Леанід Дайнека / В. К. Шынкарэнка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Аддз-не гуманіт. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы. — Мінск : Беларус. навука, 2003. — Т. 4, кн. 2 : 1986—2000 / С. А. Андраюк [і інш.]. — С. 466—494.

23. *Шынкарэнка, В. К.* Нястомных пошукаў дарога: праблемы паэтыкі сучасн. беларус. гіст. прозы / В. К. Шынкарэнка ; Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. — Мінск : Беларус. навука, 2002. — 206 с.

*Дадатак 1*

**Літаратура ў дапамогу пры вывучэнні рамана Л. Дайнекі «Меч князя Вячкі»**

*Бензярук, А.* Мячы Грунвальда, альбо Дванаццаць абаронцаў караля : аповесць пра гераічны час і славутых рыцараў / А. Бензярук. — Мінск : Маст. літ., 2012. — 127 с.

*Бохан, Ю.* Зброя Вялікага Княства Літоўскага, 1385—1576 / Ю. Бохан. — Мінск : Беларусь, 2003. — 87 с.

*Васючэнка, П.* Маленькі збраяносец : зб. п'ес для драм. і лялеч. тэатр. калектываў / П. Васючэнка. — Мінск : Беларус. ін-т праблем культуры, 1999. — 128 с.

*Жарков, С. В.* Рыцарские замки, метательные машины и пушки Средневековья / С. В. Жарков. — Минск : Друк-С, 2006. — 176 с.

*Караткевіч, У.* Дзікае паляванне караля Стаха : аповесць / У. Караткевіч. — Мінск : Юнацтва, 1989. — 270 с.

*Юрага, Л.* Меч Маладзіковага Промня / Л. Юрага // Маладосць. — 2016. — № 9. — С. 108—132.

*Дадатак 2*

**Літаратура ў дапамогу пры да вывучэнні рамана Л. Дайнекі «След ваўкалака»**

*Абуховіч, А.* Ваўкалак / А. Абуховіч // Творы / А. Абуховіч. — Мінск : Маст. літ., 1991. — С. 15.

*Арлоў, У.* Час Чарадзея / У. Арлоў // Таямніцы полацкай гісторыі / У. Арлоў. — Мінск : Беларусь, 1994. — С. 43—69.

*Баршчэўскі, Я.* Ваўкалак / Я. Баршчэўскі // Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі. — Мінск : Маст. літ., 1990. — С. 72—84.

Ваўкалакі // Бяздоннае багацце : легенды, паданні, сказы / склад. А. І. Гурскі. — Мінск : Маст. літ., 1990. — С. 237—239.

*Іпатава, В.* Ваўкалакам абярнуся / В. Іпатава // Прадыслава : аповесці і апавяданні / В. Іпатава. — Мінск : Беларусь, 1997. — С. 190—194.

Слова пра паход Ігаравы / [пер. Р. Барадуліна]. Песня пра Зубра : паэмы / М. Гусоўскі ; [пер. Я. Семяжона ; да зб. у цэлым: уклад. В. В. Кушнярэвіч]. — Мінск : Маст. літ., 1999. — 186 с. — (Шк. б-ка).

*Чаропка, В.* Усяслаў Брачыславіч / В. Чаропка // Імя ў летапісе / В. Чаропка ; прадм. А. М. Сідарэвіча. — Мінск : Полымя, 1994. — С. 43—52.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 18.01.2022 г.*